УДК 94 (476)

# ДА ПЫТАННЯ ЛІКВІДАЦЫІ МІХАІЛА ВІТУШКІ Ў СТУДЗЕНІ 1945 г. ПА МАТЭРЫЯЛАХ ЛІТОЎСКАГА АРХІВА КДБ

**Машнюк Г. А.**
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
(г. Полацк, Беларусь)

Анатацыя. У артыкуле на падставе апублікаваных архіўных дакументаў з Літоўскага архіва КДБ і беларускай гісторыяграфіі праведзены аналіз факту забойства Міхаіла Вітушкі ў студзені 1945 г.

Ключавыя словы: антысавецкі супраціў, Народны камісарыят унутраных спраў (НКУС).

Summary. In the article, on the basis of published archival documents from the Lithuanian archives of the KGB and the Belarusian historiography, an analysis was made of the fact of the murder of Mikhail Vitushka as a result of a battle with Soviet troops.

Keywords: Anti-Soviet resistance, Belarusian Independent Party (BIP), People's Commissariat of Internal Affairs (NKVD).

На сёняшні дзень постаць Міхаіла Вітушкі ў беларускім грамадстве выклікае супярэчлівае стаўленне – ад негатыўнага да ўсхвалення як "нацыянальнага героя Беларусі". Гэта ў першую чаргу звязана з гістарычным перыядам, у які дзейнічала дадзенная асоба, а менавіта Вялікая Айчынная вайна і антысавецкі супраціў на тэрыторыі Беларусі ў пасляваенны час.

У сучаснай беларускай гістарыяграфіі вядуцца спрэчкі наконт таго, ці быў забіты М. Вітушка, ці застаўся жывы. Напрыклад, у працах С. Ярша сцвярджаецца, што М. Вітушка перабраўся на Захад і пражываў у Германіі да 2006 г. [1, с. 228].

Перад тым як зрабіць спробу адказаць на дадзенае пытанне, разгледзім асноўныя вехі жыцця і дзейнасці даследуемай намі асобы.

Міхаіл Афанасьевіч Вітушка нарадзіўся 5 лістапада 1907 г. у Нясвіжы. Скончыў Віленскую гімназію, Варшаўскі і Пражскі палітэхнікумы. Быў удзельнікам Беларускай Незалежніцкай Партыі (БНП). Актыўна супрацоўнічаў з нямецкай акупацыйнай адміністрацыяй падчас акупацыі тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. З восені 1941 г. займаў пасаду памочніка начальніка Мінскай гарадской паліцыі. З лістапада 1941 г. таксама займаў пасады ў Бранскай акупацыйнай акрузе [1, с. 228; 10, с. 90].

Кар'ерны рост М. Вітушкі адбыўся пад канец нацысцкай акупацыі Беларусі, калі нямецкімі спецслужбамі рыхтаваўся дэсантны батальён "Дальвіц", фарміраванне якога пачалося ў Прусіі ў ліпені 1944 г. у мястэчку Дальвіц. Мэтай стварэння дадзенага падраздзялення з'яўлялася правядзенне дыверсійных аперацый у тыле савецкіх войск. БНП планавала з дапамогай батальёна падняць паўстанне ў Беларусі. Сам батальён быў укамплектаваны з ліку беларусаў – у асноўным удзельнікі СБМ, БНП, БКА (агульнай колькасцю 200 чалавек) і падзяляўся на дзве роты ("Паўночныя" – камандзір А. Рудак, "Паўднёвыя" – камандзір М. Зуй). Пры падрыхтоўцы дэсантнікі вывучалі сапёрную справу, тапаграфію, тактыку вядзення партызанскай вайны, авалодванне ўсімі відамі агнястрэльнай зброі. У батальён былі набраныя і жанчыны ў якасці радыстак і медсясцёр. Тэрмін навучання першапачаткова быў 4–6 месяцаў, але па прычыне хуткага наступлення Чырвонай арміі тэрмін навучання быў скарочаны [2, с. 95–96].

БЦР (Беларуская Цэнтральная Рада), пасля эвакуацыі ў Гданьск, садзейнічала стварэнню батальёна "Дальвіц". У Беларусь 17 лістапада 1944 г. былі адпраўлены ў раён Ліды, Банавічаў і Пастаў тры дэсанты колькасцю 30 чалавек у кожнай групе. Дэсантнікамі кіравалі: М. Вітушка, Г. Багдановіч. Практычна ўсе дэсанты былі знішчаны ў хуткім часе дзяржбяспекай, У. Родзька трапіў у палон і быў расстраляны ў 1946 г. [8, с. 63]. Кожны жаўнер меў пры сабе аўтамат са 100 патронамі, пісталет на 50 патронаў і 1,5 кг узрыўчаткі. Кожная група мела пры сабе ручны кулямёт, адзін супрацьтанкавы гранатамёт, некалькі супрацьтанкавых гранат і мін. Скарцені меркаваў ператтварыць батальён у полк колькасцю 700–800 чалавек, у які, акрамя беларусаў, могуць увайсці і ўкраінцы [9, с. 215].

Сярод груп дэсантнага батальёна "Дальвіц" можна адзначыць наступныя групы, якія так ці інакш праявілі сябе ў антысавецкім супраціве. Напрыклад, група Яна Гінько, якая 17 лістапада 1944 г. дэсантавалася ў раёне Ліды, аднак у снежні гэтага ж года была знішчана НКУС. Дэсант Я. Гінько, паводле ўспамінаў удзельнікаў, меў вельмі добрае ўзбраенне. У яго лік уваходзілі дробнакаліберныя мінамёты, кулямёт ДП-27, аўтаматы і боепрыпасы. Можна зрабіць меркаванне, што дадзены дэсант быў адпраўлены на тэрыторыю Беларусі ў выніку правядзення савецкімі контрразведчыкамі радыёгульні з абверам пад назвай "Вогнішчы" [6, с. 77, 89–93]. На базе групы Яўгена Жыхара, якая дзейнічала ў раёне Пастаў, у 1945 г. быў створаны аддзел, які да 1957 г. знішчыў каля 30 супрацоўнікаў міліцыі [7; 8].

Дэсант, у якім удзельнічаў М. Вітушка (меў мянушкі "Рысь", "Рус", "Лось"), адбыўся ў лістападзе 1944 г. Разам з ім было 27 чалавек, дэсант быў высаджаны ў ноч з 30 лістапада на 1 снежня 1944 г. у раёне горада Вільнюс каля мястэчка Солнечнікі [3, с. 207]. Мэтай дзеяння атрада М. Вітушкі з'яўляўся збор дадзеных аб размяшчэнні савецкіх войск, а таксама правядзенне антысавецкіх прапагандысцкіх акцый. М. Вітушка далучыўся разам з Глебам Багдановічам, Міхаілам Грыцкевічам і Тамарай Чэрэмчагінай да атрада Арміі Краёвай [2, с. 95].

Па дадзеных дакументаў з архіва КДБ ЛССР М. Вітушка быў забіты ў студзені 1945 г., разам з ім быў ліквідаваны атрад Арміі Краёвай пад кіраўніцтвам Чэслава Станкевіча "Камара". У забітага М. Вітушкі быў знойдзены пашпарт грамадзяніна СССР на яго ж імя [5].

Згодна з дакументам ад 11 снежня 1945 г. М. Вітушка быў ліквідаваны 7 студзеня 1945 г. у Рудніцкай пушчы, што знаходзіцца ў раёне г. Вільнюса. Аднак у 1949 г. намеснік міністра дзяржбяспекі ЛССР дае запыт на месцазнаходжанне арыштаваных удзельнікаў атрада "Камара" – Чэслава Станкевіча, Багдана Кузьмежа, Міхаіла Шпілеўскага і Міхаіла Юзэфавіча Цецянца для апазнання М. Вітушкі па фотакартцы [5].

21 студзеня 1950 г. быў зроблены запыт на крымінальны вышук М. Вітушкі: "МГБ ЛССР списком опасных преступников, подлежащих розыску и немедленному аресту, № I <…> объявлен в розыск Витушко Михаил Афанасьевич, 1907 года рождения" [5]. У дакуменце ад 2 чэрвеня 1950 г. зроблена заключэнне,



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

што М. Вітушка быў забіты пры ліквідацыі банды Ч. Станкевіча ў 1945 г. У пастанове ад 24 жніўня 1950 г. пошук М. Вітушкі быў спынены [5].

У 2016 г. былі выкладзены ў адкрыты доступ засакрэчаныя раней дакументы ЦРУ аб антысавецкім супраціве ў СССР. У апублікаваных дакументах змешчана інфармацыя (поўныя біяграфічныя і фізічныя даныя) пра нейкага Міхаіла Вітушку [4]. Адзначаецца, што дадзеныя дакументы ЦРУ складаліся з жніўня 1946 г. У апублікаваным дакуменце пра М. Вітушку ёсць наступная інфармацыя: “Міхаіл Вітушка – а. МОВ справа ўтрымлівае ўсю даступную інфармацыю па тэме MGKA 9838, і дадаткі ўтрымліваюць поўныя біяграфічныя і фізічныя дадзеныя. Іншыя даведкі MGBA 872. Люты 1950 г. MSO 924. 14 жніўня 1946 г. і MGKW 3356 7 лістапада 1949 г.” [4].

З гэтага вынікае, што ў дадзеных дакументах даваліся спасылкі на дакументы пра М. Вітушку, але пра гэта можна даведацца, калі будуць рассакрэчаны тыя справы, на якія спасылаюцца ў дакуменце.

Такім чынам, М. Вітушка, прайшоўшы падрыхтоўку ў дэверсійнай школе ў м. Дальвіц, быў дэсантаваны ў раён Вільнюса, дзе далучыўся да аддзела Арміі Краёвай і ў выніку боя быў ліквідаваны ў студзені 1945 г. Органы дзяржбяспекі ЛССР некалькі разоў падавалі запыты на пошук М. Вітушкі, але адказы прыходзілі пра яго ліквідацыю. У выніку ў 1951 г. крымінальны пошук быў спынены.

**Літаратура:**


1. Арлоў, У. Імёны свабоды / У. Арлоў. – Радыё Свабодная Эўропа, 2007. – 576 с.
2. Валаханович, И. «Черный кот» и его предводители. Провал попыток создания антисоветского белорусского повстанческого движения / И. Валаханович // Беларуская думка. – 2015. – № 12. – С. 94–102.
3. Косміч, Д. За вольную суверэнную Беларусь / Д. Косміч. – Вільня: Gudnas, 2006. – 224 с.
4. Документы ЦРУ опровергли «Советскую версию» смерти Михаила Витушки [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: < https://belsat.eu/ru/news/dokumenty-tsru-oprovergli-sovetskuyu-versiyu-smerti-mihaila-vitushko/>. – Дата доступа: 20.01.2019.
5. Дрозд, Д. Жив или мёртв Михаил Витушко? (документы) [Электронный ресурс]. – 2016. – Режим доступа: https://bydc.info/news/530-zhiv-ili-mjortv-mikhail-vitushko-dokumenty. – Дата доступа: 20.01.2019.
6. Ёрш, С. Дэсант у няпэўнасць. Беларускі парашутны батальён “Дальвіц”. 1944–1945 гг. / С. Ёрш. – Мінск, 2012. – 311 с.
7. Праклятыя і забытыя, дак. фільм, ч. 1 [Электронны рэсурс]. – 2013. – Рэжым. доступа: <https://www.youtube.com/watch?v=X_LTGimsPD0&t=4s> Дата доступа: 20.01.2019.
8. Прокляты и забыты: док. фильм, ч. 2 [Электронный ресурс]. – 2013. – Рэжым. доступа: < https://www.youtube.com/watch?v=dD7nZhu9scU>. – Дата доступа: 20.01.2019.
9. Соловьев, А. К. Белорусская Центральная Рада: создание, деятельность, крах / А. К. Соловьев. – Минск: Наука и техника, 1995. – 176 с.
10. Романько, О. В. Коричневые тени в Полесье. Белоруссия 1941–1945 / О. В. Романько. – Москва : Вече, 2008. – 432 с.
11. Черняков, Д. И. Православная церковь на Брянщине в период нацистской оккупации (август 1941 г. – сентябрь 1943 г.) / Д. И. Черняков // Вестник ПСТГУ. Серия II: История. История Русской Православной Церкви. – 2011. – Выпуск 5. – С. 85–95.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова